Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва

## Віртуальная выстава «Бязмежная мелодыя таленту»

## да 115-годдзя з дня нараджэння

# Лукаса Дзмітрыя Аляксандравіча (1911-1979)

## беларускага кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР



*Д. А. Лукас. 1973 г.*
*Ф. 139. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 8.*

# Лукас Дзмітрый Аляксандравіч (1911-1979) – беларускі кампазітар, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

Лукас Дзмітрый Аляксандравіч нарадзіўся ў Свянцянах Віленскай губерні (цяпер г.Швянчоніс, Літва) ў сям'і чыгуначнага рабочага 16 чэрвеня 1911 года. Маці працавала сельскай настаўніцай. Бацька будучага музыканта загінуў у час першай сусветнай вайны.




Вольга Афанасьеўна Лукас з сынам Дзмітрыем. 1911 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 209.

Сям'я пераехала ў Сярэднюю Азію, у г.Самарканд. Там у 1925 г. Дзмітрый скончыў сямігадовую школу і разам з маці пераехаў у г.Ржэў Цвярской губерні (цяпер Калінінская вобл.). У 1926 г. – у г.Гомель, дзе паступіў ў Гомельскі тэхнікум шляхоў зносін. Яму давялося самому думаць пра кавалак надзённага хлеба. Ён паспяхова закончыў чыгуначную школу-дзевяцігодку. Абараніўшы дыплом, Дзмітрый Лукас працаваў слесарам, машыністам паравоза, выкладчыкам школы ФЗН пры заводзе "Рухавік рэвалюцыі".



Д. А. Лукас. Студэнт кансерваторыі. 1938 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 1.

Прага да музыкі ў юнака заўважалася даўно. Ён актыўна ўдзельнічаў у гуртках мастацкай самадзейнасці, потым у музычнай школе вывучаў “азы” нотнай граматы, а з 1932 г. пачаў займацца ў Гомельскім музычным тэхнікуме.



Р. К. Пукст, Д. А. Лукас. 1932 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 210. Арк. 1.



Д. А. Лукас у ролі Ленскага ў оперы П. І. Чайкоўскага «Яўгеній Анегін», пастаўленай студэнтамі Гомельскага музтэхнікума. 1932 г. Ф. 139. Воп. 1. Спр. 208.

Навучанне ў класе співаў В.Зайцавай і ў класе кампазіцыі Р.Пуксту ў 1931-1936 гг. дазволілі Д.Лукасу працягнуць прафесійную адукацыю ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, дзе ён займаўся спачатку ў класе кампазіцыі М.Аладава, а затым прафесара В.Залатарова. Да часу вучобы ў кансерваторыі ў перадваенны перыяд адносяцца яго першыя сур’ёзныя музычныя творы. У 1937 годзе ён быў прыняты ў Саюз кампазітараў БССР. Пасля заканчэння ў 1941 годзе кансерваторыі Д.Лукас працаваў інспектарам рэперткама ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР.



9/III 43 г. Самарканд
Дорогой Толя!
Не знаю добралось ли до тебя 2 мое письмо писанное с дороги. Во всяком случае с нетерпением дожидаюсь ответа от тебя. Скоро уже месяц, как я в Самарканде. Установили мне инвалидность 2ой группы. Устроился работать худруком Красноармейского ансамбля песни и пляски. Но беда что ансамбль сугубо самодеятельный - нет голосов, да и трудно иметь дело с перегруженными курсантами. Платят 500 руб. Имею, оказывается право быть прикрепленным к магазину научных работников как член Союза СК, но из документов у меня сохранился лишь членский билет Музфонда. Спасибо что ученая ко[illegible] по прикреплению удовольствовалась этим документом и



письменным заявлением. Во всяком случае удостоверение о членстве ССК БССР мне нужно иметь. Если тебя это не затруднит - пришли мне как председатель союза такую справку или удостоверение. Вообще мне сейчас не особенно весело живется если учесть отсутствие всякого скарба одежды плюс еще болезнь [illegible]. Хочу написать по этому вопросу письмо в Музфонд СССР - может быть и помогут чем, как инвалиду. Убедительно прошу тебя написать мне и выслать удостоверение по адресу: г. Самарканд (У) ул. Льва Толстого 10 Д. Л.
Пока кончаю с тов. приветом Д. Л.
Сердечный привет Наталье Сергеевне

**Ліст Д. А. Лукаса да А. В. Багатырова. 1943 г.**
**Ф. 190. Воп. 2. Спр. 196. Арк. 2.**

**У гады Вялікай Айчыннай вайны кампазітар праходзіў службу у 49-ым запасным стралковым палку ў с.Лугавая Пралейка, затым у Камышыне, Сталінградзе і Молатаве, дзе быў курсантам Растоўскага артылерыйскага вучылішча. У 1942 г. дэмабілізаваўся з войска па хваробе, быў кіраўніком ансамбля песні і танца Ваенна-ветэрынарнай акадэміі ў Самаркандзе, кіраўніком Рэпертуарнай камісіі БССР у Маскве.**










**Варыянты гімнаў для 6-ці і 4-х галаснога змешанага хору з ф-п, напісаныя на конкурс беларускага гімна. Аўтограф, рукапіс. 2 мая 1944 г. Ф. 139. Воп. 1. Спр. 74. Арк. 1-3.**

Выступленне кампазітара Лукаса.

В.Е.

x x x

Яшчэ ў эвакуацыі ў Маскве ў мяне і беларускага драматурга Міхася Клімковіча ўзнікла думка – стварыць вялікае музыкальна-драматычнае палатно аб герaічным сыне беларускага народа, легендарным героі Кастусе Каліноўскім. У красавіку 1944 года я атрымаў першую карціну лібрэта і пачаў працаваць над музыкай оперы. Работа адразу захапіла мяне.

Першыя карціны оперы ствараліся ў вельмі цяжкіх умовах. Родная беларуская зямля знаходзілася пад ігам нямецка-фашысцкіх акупантаў. Сэрца разрывалася на часткі пры думцы аб тым, што ўсё наша шчаслівае жыццё, жыццё людзей сталінскай эпохі так нечакана і трагічна парушана ўтаржэннем звяроў у чалавечых вобразах. Вялікая чалавечая боль за пакуты роднай Беларусі перадаілі і творчы ўздым.

Працаваў я з вялікім энтузіязмам. Да моманту вызвалення Беларусі ў мяне было напісана ў клавіры 75 процантаў оперы. На працягу паследуючага перыяда я прадоўжаў працаваць над заканчэннем клавіра і аркестроўкай оперы. Вяртанне ў родны Мінск дало мне новыя сілы, выклікала новыя творчыя імкненне.

Тры месяцы таму назад пачаліся работы над пастаноўкай оперы ў Беларускім Дзяржаўным тэатры оперы і балета. Многа каштоўных і цікавых думак падказаў мне галоўны рэжысёр тэатра пастаноўшчык оперы таварыш Літвінаў. Па яго ўказанню я перарабіў пачатак другой карціны першага акта.

Агульнымі творчымі намаганнямі створан цікавы оперны спектакль прэм"ера якога з"яўляецца падарункам да 30-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Сёння я перажываю незабыўныя хвіліны. Бачыць на сцэне ў цудоўным выкананні сваю оперу – гэта вялікая радасць, вялікае шчасце.

2

Мне хочацца выказаць гарачую падзяку аўтару лібрэта Міхаілу Нікалаевічу Клімковічу, галоўнаму дырыжору тэатра Анісіму Міхайлавічу Брону і пастаноўшчыку Барысу Канстанцінавічу Мардвінаву, а такасама асноўным выканаўцам оперных партый і ўсяму калектыву тэатра.

Незабыўнае ўражанне пакідае заслужаны артыст Армянскай ССР Нікалай Нікалаевіч Сердобаў, які выконвае роль Кастуся Каліноўскага. Створаны ім вобраз народнага героя гэта той вобраз, які я заўсёды бачыў у сваіх творчых марах. Смелы, мужны, нястомны барацьбіт за вялікую народную справу, ён з горда паднятай галавой ідзе да шыбеніцы. Кастусь Каліноўскі памірае як сапраўдны герой, які аддае сваё жыццё за шчасце любімага народа.

Цудоўна ў ролі Марыі народная артыстка Саюза ССР Ларыса Пампееўна Александроўская. Выдатныя вакальныя даныя і сцэнічны талент артысткі дапамагаюць стварыць ёй незабыўны вобраз.

Выдатна выконвае ролю Мураўёва артыст Афанасій Паўлавіч Белоў.

Опера "Кастусь Каліноўскі" гэта вялікі этап у маім творчым жыцці. Гледачы ацэняць як справіўся я з задачай паказаць у музыцы мужнага, бясстрашнага барацьбіта за народнае шчасце.

x x x

У самы разгар вайны, з 1943 года, кампазітар пачынае працаваць над сваім галоўным творам – операй “Кастусь Каліноўскі” (лібрэта паэта Міхася Клімковіча). Прэм’ера “Кастуся Каліноўскага” адбылася 7 лістапада 1947 года на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР. Яна адкрывала Першы сезон Вялікага тэатра ў рэканструяваным пасля вайны будынку і прайшла з вялікім поспехам. Пастаноўка оперы “Кастусь Каліноўскі” стала значнай падзеяй культурнага жыцця сталіцы і музычна-тэатральнага мастацтва Рэспублікі ў першыя пасляваенныя гады.

**Выступленне Д. А. Лукаса аб оперы «Кастусь Каліноўскі». Машынапіс. 1948 г. Ф. 139. Воп. 1. Спр. 172.**


(1)

1947-ой год. В огромном белом репетиционном зале Оперного театра идет мизансценная репетиция моей оперы "Кастусь Калиновский". Репетируется сцена убийства Марыси Грегарович Мечиславом после предательства Марысей Кастуся. Репетируют Л. П. Александровская и В. Лапин. Вдруг во время репетиции Лариса Помпеевна пошатнулась, побледнела. Ее тут же подхватили, уложили на диван, вызвали театрального врача, сделали укол и, когда она пришла в себя, настойчиво потребовали прекратить репетицию и отправить Александровскую домой. Каково же было общее изумление, когда она поднялась, встала и, как ни в чем не бывало, сказала: "Ну! будем продолжать репетицию!" Никакие уговоры и настойчивое вмешательство врача не помогли — Лариса Помпеевна продолжала репетировать до конца сцены. Я подумал тогда: "Надо же настолько любить свое нелегкое дело, отдаваться ему до конца, чтобы так мужественно и самозабвенно служить ему, не смотря на слабость, вызванную сердечным припадком". Этот случай мне запомнился на всю жизнь, как пример самоотверженного служения своему искусству, как образец жизненного поведения для себя.

С Ларисой Помпеевной Александровской я познакомился еще до Великой Отечественной войны перед первой декадой белорусского искусства в Москве. Я слышал ее во многих партиях в операх П. Чайковского "Евгений Онегин" /Татьяна/, "Пиковая дама" /Лиза/, слушал в заглавной партии в опере Ж. Бизе "Кармен". И всюду она поражала своим необыкновенно красивым могучим голосом, тонкой сценичностью, умением проникать в самые глубины творчества того или иного оперного композитора. Обогащенная в своем обширном репертуаре лучших мастеров, Лариса Помпеевна совершенно преображалась в ролях наших современников. Здесь и нежная деревенская девушка — Марыся /опера Е. Тикоцкого — "Михась Подгорный"/ и гневная, суровая мстительница — Алеся /опера Е. Тикоцкого "Алеся"/.

Чрезвычайно богатый творческий диапазон великой белорусской артистки-певицы, ее умение проникнуть в глубины авторских партитур, создали ей славу по нашей республике и далеко за ее пределами. Особенно радостны мне — автору


(2.)

воспоминания об исполнении Л. П. Александровской партии Марыси Грегарович в моей опере "Кастусь Калиновский". Казалось откуда взялись у простой, доброй, милой белорусской женщины этот аристократический гонор гордой полячки-фанатички, которая не останавливается ни перед предательством, ни перед обольщением для достижения своих целей в польском правом крыле восстания 1863 г.

Поздравляя дорогую Ларису Помпеевну со славным 75-и летием, хочется еще раз подчеркнуть ее многообразную творческую и общественную деятельность. Она — певица-артистка, она непревзойденная концертная исполнительница, первая пропагандистка белорусской народной песни, она — режиссер, она неутомимый общественный деятель.

Пожелаем же Л. П. Александровской долгих, долгих лет жизни и счастья.

Она подлинно народная артистка в самом высоком смысле этого слова.

Д. Лукас

Композитор, заслуженный деятель искусств БССР

Успаміны Д. А. Лукаса аб Л. П. Александроўскай. 1971 г. Ф. 139. Воп. 1. Спр. 174. Арк. 1,2.




«Кастусь Каліноўскі». Опера ў 4-х падзеях, 7 карцінах. Лібрэта М.М.Клімковіча. Акт I. Партытура. Аўтограф. 1947-1948 гг. Ф. 139. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 36.







Д. А. Лукас. Раманс “Фіялкі” (на словы Э. Агняцвет). 1945 г.
Ф. 105. Воп. 2. Спр. 21. Арк. 1, 5.

Пасля вайны Дзмітрый Лукас працаваў начальнікам музычнага аддзела Дэпартамента мастацтваў БССР, старшым рэдактарам Белдзяржвыдату, быў галоўным рэдактарам музычнага вяшчання, а затым мастацкім кіраўніком Беларускага радыё. З 1965 года Дзмітрый Аляксандравіч Лукас выкладаў у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Горкага, кіраваў вакальнай кафедрай.



Г. М. Вагнер, Д. А. Лукас, У. В. Кухта. Мінск, радыёкамітэт. [1950]
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 210. Арк. 2.



1 рад: – , Р. К. Пукст, Р. В. Млодак, Д. А. Лукас, Д. М. Жураўлёў.
2 рад: удзельнікі сэкстэта домбр. Радыё. 1953 г.
Ф. 105. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 9.

**Асобнае месца ў творчасці кампазітара займае цыкл песень, прысвечаных будаўнікам Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, з якімі ў яго была моцная дружба.**



**Сустрэча з рускімі і беларускімі пісьменнікамі падчас правядзення Тыдня рускай літаратуры ў Беларусі. (Д. А. Лукас – другі злева). Наваполацк. «Нафтастрой». Жнівень 1962 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 214. Арк. 1.**



2

## Большой друг строителей

Нефтестроевцы горячо полюбили талантливого белорусского композитора Дмитрия Александровича Лукаса. Они полюбили его не только за оперу «Кастусь Каліноўскі», музыку в кинофильмах «Нестерка», «Дети партизан», «Человек не сдается», симфонии и романсы. Большой авторитет среди строителей композитор заслужил за то, что он связал свое творчество с жизнью и трудом рабочих — первым написал две песни, посвященные нашим нефтестроителям.

Дмитрий Александрович отдает много таланта и сил Нефтестрою. 16 июня в творческой команди[illegible] совместно с строителями, [illegible] здесь свой пятидесяти[illegible]. А в июле и августе Лукас пробыл у нас целый месяц.

Большую помощь оказал композитор художественной самодеятельности. Он организовал хор из 25 человек, помог разучить свою песню нефтестроителей на слова Сергея Граховского.

Солистам т. Лукас проиграл и показал ноты своей песни «Лирическая нефтестроевская» на слова мастера СУ-124 Валентина Лукша.

Тесная дружба завязалась у композитора с пионерами и школьниками поселка Полоцкий. В пионерском лагере он провел беседу о музыке, о жизни и учебе китайских детей. Рассказал о своем жизненном пути и творчестве.

В детском саду малыши показали свою художественную самодеятельность. Композитор дал хорошую оценку культурному развитию детей.

Помимо музыкальной деятельности, композитор провел значительную общественно-политическую работу. В редакции многотиражки он вел разговор с молодыми поэтами о том, чтобы они больше создавали стихов и текстов для песен о строителях. На объектах, в цехах завода железобетонных изделий тов. Лукас провел много бесед о народном Китае, который он навестил в 1959 году.

К. ФЕДОРОВ.

Яков ХЕЛЕМСКИЙ.

**Газета «Знамя новостройки». 18 жніўня 1961 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 204. Арк. 1.**





**Д. А. Лукас с дзецьмі ў піянерскім лагеры «Нафтастрой». 1962 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 215. Арк. 1, 2.**



**А. Г. Русак, Д. А. Лукас (у цэнтры) сярод студэнтаў і школьнікаў .**
**Радашковічы. 1965 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 216. Арк. 1.**



Лукас, Д. А. 1

Список основных сочинений

| №№ | Наименование сочинения | |
|---|---|---|
| 1. | Опера "Кастусь Калиновский" по либретто М. Климковича | рукопись, премьера 8/X 1947 г. в Бел. гос. театре оперы и балета. Изданы в изд. "Беларусь" отдельные хоры и арии, в изд. "Музгиз" ария Калиновского, 1962 г. |
| 2. | Опера "Песня о счастье" по либретто М. Климковича | Рукопись |
| 3. | Детская опера "Рак-усач" по сказке Я. Коласа | Рукопись, записана для радио. |
| 4. | Музыка к кинофильмам: "Беловежская пуща", 1952 г., "Новый Минск", 1954 г., "Дети партизана", 1954 г., "Сестерка", 1955 г., "Посеяли девушки лен", 1956 г., "Счастье надо беречь", 1958 г., "Строгая женщина", 1959 г., "Человек не сдается", 1961 г. | рукописи. |
| 5. | Музыка к драматическим спектаклям: "Ночь в сентябре", "Годы испытаний", "Брат героя", "Бронепоезд 14-69", "Константин Заслонов", "Молодая гвардия", "Смерть воеводы", "Живой труп", "Великая сила" и др. | рукописи, поставлены в Бел. ТЮЗе. рукописи, поставлены в театре им. Я. Купалы. рукопись, поставлена в театре им. Я. Коласа |
| 6. | Музыка к радиопостановкам: "Пинская шляхта", "Наш сосед Джонни" и др. | рукописи, записаны для радио. |
| 7. | Струнный квартет №1, струнный квартет №2 | рукопись; издан в изд. "Беларусь", 1957, записан для радио |
| 8. | 2 сюиты на темы песен самодеятельных композиторов для духового оркестра | рукописи |
| 9. | "Белорусская сюита" для русского народного оркестра | издана в изд. "Музгиз" |



Список основных сочинений 2

| | | |
|---|---|---|
| 10. | Вокальный цикл "Мелодии", текст Леси Украинки, перевод на бел. язык Э. Огнецвет | издан в изд. "Беларусь", 1958 г. |
| 11. | Оратория для солистов, хора и симф. оркестра в 3-х частях, текст Э. Огнецвет. | первое исполнение по радио, Минск, 1949 г.; изданы отрывки в изд. "Беларусь", 1952 г. |
| 12. | Вокально-фортепианный цикл "Времена года" (19 романсов и 4 ф. п. прелюдии), тексты Э. Огнецвет | рукопись, отдельные романсы записаны на грампластинки и для исполнения по радио |
| 13. | Симфония h-moll | рукопись, первое исполнение оркестром Бел. госфилармонии 1961 г. |
| 14. | Ряд романсов для различных голосов, вокальных дуэтов, квартетов | Часть издана в изд. "Беларусь" в разные годы, многие романсы записаны для радио. |
| 15. | Ряд песен для массового хора, солистов, детского хора | Часть издана в разные годы в изд. "Беларусь", "Музгиз", "Советский композитор", печатались в периодической печати. Многие записаны для радио. |
| 16. | Обработки народных песен для хора, солистов, отдельных инструментов, для детского исполнения. | Отдельные изданы. Многие записаны для радио. |
| 17. | Концертино для голоса с симф. оркестром. | рукопись |
| 18. | Большое количество статей о композиторах, исполнителях, музыкальных произведениях, о самодеятельности, по проблемным эстетическим вопросам | печатались в газетах центральных и республиканских, в журналах. |
| 19. | Цикл лекций для детей о вокальной музыке. | Записаны для радио, рукописи. |
| 20. | Цикл лекций для детей об инструментах симфонического оркестра | Записаны для радио, рукописи. |

**Спіс твораў Д. А. Лукаса.**
**Аўтограф. 1966 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 177. Арк. 1,2.**

**У творчым партфелі кампазітара Дзмітрыя Аляксандравіча Лукаса – сімфонія ў чатырох частках, два квартэты, Беларуская сюіта ў трох частках, сюіта для аркестра беларускіх дудак, дзясяткі песень для хору, для голасу і фартэпіяна, для вакальнага дуэта, мноства рамансаў, апрацовак беларускіх народных песень і песень самадзейных кампазітараў рэспублікі. Ён з'яўляецца аўтарам музыкі да драматычных спектакляў "Ноч у верасні", "Гады выпрабаванняў", "Брат героя", "Чырвоная шапачка" (разам з Я. Цікоцкім), "Маладая гвардыя", "Канстанцін Заслонаў", "Пінская шляхта", "Жывы труп", "Злавацца не трэба". Членам Саюза кампазітараў БССР Д.А.Лукас стаў у 1937**

Д.А.Лукас аўтар музыкі да шырокавядомых стужак “Несцерка”, “Шчасце трэба зберагчы”, “Строгая жанчына”, “Чалавек не здаецца”, “Пасеялі дзяўчаты лён”, “Белая вежа”, “Дзеці партызана” (разам з Г. Паповым).




Д. А. Лукас. Музыка да фільму У. У. Корш-Сабліна «Пасеялі дзяўчаты лён». Аўтограф. 1955 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 1.




Д. А. Лукас. Музыка да радыёспектакля «Пінская шляхта». Клавір. Чарнавы варыянт. Аўтограф. 1946 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 33. Арк. 1.



2

Дзяржаўны Камітэт
Савета Міністраў БССР
па радыёвяшчанню
і тэлебачанню
ўзнагароджвае
Дыпломам

таварыша Лукаса Дзмітрыя Аляксандравіча

за актыўную работу на радыё і тэлебачанні і ў

сувязі з 40-годдзем Беларускага радыё і 10-годдзем

Беларускага тэлебачання.

Старшыня
Дзяржаўнага Камітэта
Савета Міністраў БССР
па радыёвяшчанню
і тэлебачанню /В.Палескі/

Мінск
23 снежня 1965 г.

Дыплом Дзяржтэлерадыё БССР. 1965 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 187.



2

ДОРОГОЙ ДМИТРИЙ АЛЕКСАНДРОВИЧ!

Студенты и профессорско-преподавательский состав филологического факультета и кафедры пения Минского государственного педагогического института им. А.М.Горького горячо приветствуют Вас в день Вашего 60-летия!

Нам всем хорошо известны Ваши достижения в области развития белорусской музыки. Вы создали много произведений, ставших популярными и любимыми в народе.

Вот уже много лет Вы работаете с нами, воспитывая будущих учителей музыки и пения. Ваши питомцы, выпускники института, несут свет музыкальных знаний во все уголки нашей любимой Белоруссии. Мы и дальше вместе с Вами будем прививать им чувство прекрасного и возвышенного, будем воспитывать нашу молодежь в духе беззаветной преданности нашей прекрасной Родине!

В этот памятный день мы искренне желаем Вам богатырского здоровья, счастья и творческих успехов!

ДЕКАН ФИЛОЛОГИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА А.НАЛИВАЙКО

ЗАВ.КАФЕДРОЙ ПЕНИЯ А.ЗАГОРОДНЕВ

Віншавальны адрас Д. А. Лукасу ад Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Горкага з 60-годдзем. 1971 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 196. Арк. 2.

Лукас прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Саюза кампазітараў Беларусі, пастаянна аказваў дапамогу аматарскім мастацкім калектывам, кансультаваў самадзейных кампазітараў. У 1965 - 67 гг. абіраўся дэпутатам Мінскага аблсавета дэпутатаў працоўных 7-га склікання.



Д. А. Лукас. 1962 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 5.



Д. А. Лукас падчас сустрэчы з выбаршчыкамі.
Г. Слуцк. 9 сакавіка, 1965 г.
Ф. 139. Воп. 1. Спр. 211. Арк. 4.

За плённую творчую і грамадскую дзейнасць Дзмітрый Лукас узнагароджаны ордэнам “Знак Пашаны”, а ў 1955 годзе яму было прысвоена званне Заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.



Шырока вядомы ў нашай краіне музычныя творы беларускага кампазітара Д. Лукаса.
28 лютага па тэлебачанню будзе перадавацца яго вакальная лірыка.
На здымку: кампазітар Д. Лукас за работай.

Програма перадач Мінскай сту
тэлебачання, 1957

**Праграма перадач Мінскай студыі тэлебачання. 1957 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 7.**



**Д. А. Лукас. 1955 г.**
**Ф. 139. Воп. 1. Спр. 207. Арк. 3.**